# Гісторыя

УДК 902/904

*К. А. ПЯРФІЛЬЕВА*

## СКУРАНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XI–XIII стст.: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Посвящена археологическому изучению кожевенного и сапожного ремесел средневекового города XI–XIII вв. Рассматриваются исследовательские подходы к характеристике кожевенных ремесел (описанию их технико-технологической базы, ассортимента продукции, занимаемого места в экономической структуре древнерусского города), составлению классификационных и типологических схем. Проведены историографический анализ и систематизация, очерчены перспективные исследовательские задачи. Анализируются первые научные публикации, посвященные ремесленному производству по выделке и обработке кож, а также пошиву готовых изделий; раскрываются принципы, которые легли в основу дальнейшего многостороннего и многорегионального изучения кожевенного дела, получили ориентировочный характер, став примером описания и систематизации соответствующего археологического материала. На фактологическом материале показано, что белорусские археологи, исследуя различные аспекты кожевенного производства, а также его место в материальной культуре средневекового населения, действовали в рамках классических анализаторских схем.

***Ключевые слова:*** археология; кожевенное производство; сапожное ремесло; Древняя Русь; классификация; типология; хронология; технология производства; методы изучения.

The article presents a brief historiographical overview and is devoted to archaeological studying of the leather and shoe crafts in the medieval city of XI–XIII centuries. Existing research approaches to the characterization of leather crafts (describing their technical and technological base, product mix, place in the economic structure of ancient city), and the compilation of typological classification schemes are discussed in it. Historiographical analysis and systematization were made. Promising research tasks have been described. The first publications, that are dedicated to the production of handicraft processing of skins, and technical and technological features of tailoring of finished products, are analyzed. The principles, which formed the basis of further multilateral and multi-leather case study received indicative, becoming an example of the description and systematization of the relevant archaeological material, are disclosed. On the factual material shows that the Belarusian archeologists exploring the various aspects of the leather industry, as well as its place in the material culture of the medieval population, acted within the scope of classical analysis schemes.

***Key words:*** archeology; leather production tanning; shoemaking; Ancient Russia; classification; typology; chronology; production technology; methods of study.

Вывучэнне рамеснай дзейнасці ў сярэднявечных гарадах, яе характарыстыка і асэнсаванне на кожным гістарычным этапе з'яўляюцца адной з найбольш прыярытэтных сфер даследавання беларускіх археолагаў-медыявістаў, якая не згубіла сваёй актуальнасці да гэтага часу.

Вялікае значэнне для навуковага археалагічнага і гістарычнага асэнсавання старажытнарускай гарадской праблематыкі, тагачаснай эканамічнай і культурнай прасторы, узроўню тэхналагічных ведаў эпохі далі раскопкі ў Ноўгарадзе Вялікім, адноўленыя ў 1940-х гг. На іх падставе былі зроблены грунтоўныя вынікі адносна матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва, праведзены ўзорны тыпалагічны аналіз рэчыўных калекцый, дадзены адказы на многія гістарычныя пытанні. Таму пры звароце да вытокаў даследавання скураных рамёстваў XI–XIII стст. трэба адзначыць у першую чаргу публікацыі наўгародскіх матэрыялаў. Першай працай, прысвечанай прадукцыі скураных рамёстваў часоў Старажытнай Русі, з'явіўся артыкул Л. І. Якунінай, аснову якога склала апісанне калекцыі скураных вырабаў з раскопак 1937–1938 гг. Аўтар разглядае шэраг акалічнасцей гарбарнай справы, аналізуе тэхніку пашыву абутку і моду на яго сярод розных пластоў гарадскога насельніцтва, шырока выкарыстоўвае выяўленчыя крыніцы іканаграфічнага характару (выявы ў «Изборнику» Святаслава 1073 г., фрэскі XIV ст. са Скавародскага манастыра ў Ноўгарадзе, з царквы Святога Міколы на востраве Ліпна – выява Барыса і Глеба, выява Георгія з Юр'еўскага манастыра XII ст., фрэска з выявай Яраслава Уладзіміравіча са Спаса-Нярэдзіцкай царквы ў Ноўгарадзе Вялікім 1199 г., мініяцюра

з рукапісу XII ст. аб антыхрысце Іпаліта Папы Рымскага, на якой намаляваны рускі князь), былінны эпас, этнаграфічныя даныя. Значная ўвага ў артыкуле надаецца афарбоўцы скуранога палотнішча як яскраваму элементу «рускай» моды, а таксама іншым спосабам дэкарыравання абутку, такім як вышыўка (ніткамі, рознакаляровым ядвабам, жэмчугам) і цісненне. Адзначаючы разнастайнасць відаў старажытнарускага абутку, аўтар спрабуе высветліць час бытавання кожнага з іх і асобных элементаў канструкцыі [1]. Між іншым праца носіць агульны характар, што тлумачыцца ў першую чаргу невялікай на той час колькасцю аб'ектаў даследавання, а менавіта цэлых узораў розных элементаў абутку. Некаторыя высновы аўтара аспрэчаны ў публікацыях іншых даследчыкаў, напрыклад тэзы аб шматслойнасці скураных вырабаў і раннім узнікненні ў наўгародскіх матэрыялах ботаў на высокіх абцасах. Тым не менш былі акрэслены асноўныя праблемныя кірункі для наступных, больш дэталёвых даследаванняў.

Распрацоўка класіфікацыі, тыпалогіі і тэрміналогіі ў вывучэнні прадукцыі сярэднявечных скураных рамёстваў адбылася ў межах эталоннай працы С. А. Ізюмавай [2], якая прадвызначыла алгарытм навуковых дзеянняў па дадзенай тэматыцы. Масавасць матэрыялаў з Нераўскага канца старажытнага Ноўгарада дазволіла даследчыцы падрабязна спыніцца на вывучэнні гарбарнага і шавецкага рамёстваў. Прадстаўленая ў працы тыпалогія сярэднявечнага абутку кладзецца ў падмурак апісання археалагічных скураных калекцый і сёння. У межах храналагічнай класіфікацыі шавецкай прадукцыі прасочваецца эвалюцыя асноўных відаў абутку і яго канструкцыйных дэталей X–XVI стст., падаецца характарыстыка іншых скураных вырабаў (галантарэя, мячыкі, маскі), дэманструецца іх размеркаванне па ярусах, што непасрэдна звязана з датаваннем [2].

У рэчышчы разважанняў аб класічных даследаваннях немагчыма не ўзгадаць працы А. І. Аяцевай, дзе характарызуюцца адпаведныя калекцыі з сярэднявечных гарадскіх слаёў [3, 4], надаецца значная ўвага методыцы вывучэння прадукцыі старажытных шавецкіх майстэрань [5], праведзена дадатковая сістэматызацыя скуранога абутку і ўдасканаленне існуючых схем, распрацаваных С. А. Ізюмавай. Тыпалогія А. І. Аяцевай будуецца па іерархічным прынцыпе. Згодна з ёй першапачаткова сярэднявечны абутак падзяляецца на дзве групы – абутак мяккіх форм і абутак жорсткіх форм. У кожнай групе адпаведна выдзяляюцца тыпы на падставе фасону (формы) абутку. Так, у першую групу ўваходзяць наступныя тыпы: поршні, чаравікі (аналагічныя мяккім туфлям згодна з С. А. Ізюмавай), боты (боты і паўботы былі згрупаваны ў адзін тып, паколькі адрозніваліся толькі вышынёй халяў). Дадаткова адбываецца разбіўка на падтыпы з улікам асаблівасцей крою – цэльнакроены ці дэталёвакроены ўзор. Дэталёвую тэхніка-тэхналагічную тыпалогію, яе абгрунтаванне і апісанне канкрэтных тыпаў у тэматычных артыкулах даследчыцы дапаўняе інфармацыя храналагічнага характару, выяўленне асноўных матываў арнаментацыі чаравікаў, шматлікія аналогіі з калекцыямі іншых старажытнарускіх і сярэднявечных польскіх гарадоў.

Згаданыя працы ляглі ў аснову далейшага шматбаковага і шматрэгіянальнага вывучэння скураных рамёстваў і дэталізацыі, набылі ўзорны, арыенціровачны характар, стварылі навуковы фон для будучых даследаванняў.

Апісанне сярэднявечнага скуранога матэрыялу, які быў здабыты на тэрыторыі Беларусі, на старонках археалагічнай літаратуры з'явілася ў межах публікацый польскіх даследчыкаў (Ю. Ядкоўскага, З. Дурчэўскага), якія праводзілі раскопкі на Старым замку ў Гродне ў 1930-я гг. Ю. Ядкоўскі вызначае шавецкую майстэрню XII–XIII стст. у ніжніх слаях ускрытага ўчастка, дзе вынайдзены рэшткі шчыльнай драўлянай забудовы і разнастайная калекцыя прадметаў IX–XIII стст. Шавецкая справа на Старым замку прадстаўлена «мноствам кавалкаў скуры», экзэмплярамі абутку (мужчынскага, падобнага да «скураных лапцей», і жаночага, дэкарыраванага адтулінамі, па вызначэнні Ю. Ядкоўскага), а таксама рамесным інвентаром – ножыкамі і драўлянай калодкай («капытам», аналагі якому не былі вядомы на той момант даследчыку) [6, s. 10].

З. Дурчэўскі, які праводзіў археалагічныя доследы на Старым замку напрыканцы 1930-х гг., даючы характарыстыку матэрыяльнай культуры старажытнага насельніцтва, пералічвае ў тым ліку кавалкі скуры, вынайдзеныя ў вялікай колькасці, і скураныя нажавыя похвы [7, s. 9]. Асобнага падрабязнага апісання скураных вырабаў з раскопак 1930-х гг. на Старым замку дадзена не было. У цэлым справаздачны характар адзначаных публікацый не прадугледжваў пільнай увагі да той ці іншай катэгорыі артэфактаў.

Раскопкі на Старым замку ў Гродне былі працягнуты экспедыцыяй пад кіраўніцтвам М. М. Вароніна ў 1940-я гг. Разгорнутае апісанне калекцыі скураных вырабаў з тагачасных раскопак было прадстаўлена ў межах раздзела абагульняючай манаграфіі М. М. Вароніна па старажытным Гродне. Даследчык адзначае, што шавецкая справа на тэрыторыі Гродзенскай крэпасці адлюстравана шматлікімі абрэзкамі скуры і нарыхтоўкамі, а таксама цэлымі экзэмплярамі абутку (поршні і чаравікі) і фрагментам скуранога мацавання лыж. Аўтар традыцыйна надае ўвагу тэхніцы пашыву, вызначаючы тры тыпы поршняў. Праводзячы аналогіі, навуковец звяртаецца не толькі да старажытнарускіх калекцый з Ноўгарада Вялікага і Смаленска, але і да польскіх (калекцыя з Гнезна) і заходневалынскіх, робячы вынік аб блізкасці гродзенскіх і заходнеславянскіх узораў [8, с. 62–63].

Першыя мэтанакіраваныя крокі ў вывучэнні скураных рамёстваў у Беларусі былі зроблены Г. В. Штыхавым. У артыкулах, прысвечаных гарбарнаму [9] і шавецкаму [10] рамёствам старажытнага Полацка, надаецца ўвага кожнаму з этапаў гарбарнай справы (заленне вапнай з попелам, накрыццё дзёгцем і выкручванне, квашэнне, дубленне раслiннымі рэчывамі, афарбоўка), асвятляецца алгарытм вытворчасці, інструментальнае забеспячэнне сярэднявечнага гарбара і шаўца, асартымент вырабаў, прынцыпы канструявання, прыёмы пашыву, дэкор, швы; падымаецца пытанне арганізацыі скураной вытворчасці на прадмет раменснага падзелу гарбарнай і шавецкай спраў. Аўтар адзначае незавершанасць гэтага працэсу. Так, падчас археалагічнага даследавання Полацка навукоўцамі былі выяўлены дзве майстэрні. Больш позняя, XIII ст., насіла гарбарна-шавецкі характар і адначасова з'яўлялася жылым памяшканнем. Майстэрня XII ст. – выключна гарбарная, спецыялізаваная, уяўляла асобны функцыянальны будынак, вялікі па памерах, выраб скур у ёй вёўся пастаянна, незалежна ад сезона, і, відавочна, яна была месцам працы некалькіх майстроў. Даследчык сцвярджае, што падобнае суіснаванне малых «хатніх» гарбарна-шавецкіх і вялікіх спецыялізаваных майстэрань – цалкам натуральная тагачасная з'ява [9, с. 72–73].

Асобна трэба адзначыць артыкул Г. В. Штыхава пра метады вывучэння старажытнай скуры [11]. Далучэнне да традыцыйнага арганалептычнага метаду вывучэння хімічнага, фізіка-тэхналагічнага аналізаў дазволіла аўтару прыйсці да адметных высноў наконт алгарытму вырабу скуранога палотнішча ў X–XIII стст. і адпаведна хімічных і фізіка-тэхналагічных паказчыкаў якасці скуры, апрацаванай старажытнарускімі рамеснікамі [11, с. 245–246].

Працы Г. В. Штыхава з'явіліся ўзорнымі для апісання і сістэматызацыі адпаведнага археалагічнага матэрыялу на глебе беларускай археалогіі.

Вялікая калекцыя скураных вырабаў атрымана ў выніку археалагічнага вывучэння сярэднявечнага Віцебска. Грунтоўная праца па вывучэнні скуранога абутку гэтага горада была праведзена Т. С. Бубенькай, у распараджэнні якой быў масавы і разнастайны асартымент вырабаў (800 экз.). Асноўныя вынікі былі апублікаваны ў адпаведным артыкуле [12] і ў межах асобнага раздзела абагульняючай манаграфіі па матэрыяльнай культуры сярэднявечнага Віцебска [13, с. 114–118]. Даследчыца прапанавала класіфікацыю віцебскага абутку на падставе класічных тыпалагічных схем А. І. Аяцевай і С. А. Ізюмавай, вызначыла храналагічныя межы распаўсюджвання таго ці іншага тыпу, дэталёва разгледзела тэхніку пашыву, а таксама вылучыла пяць тыпаў арнаментацыі віцебскіх чаравікаў. Характарыстыка нешматлікай скураной галантарэі – похвы (10 экз.), футляры (2), кашалькі (3), мячыкі (3) – будуецца на апісанні памераў, фасону, швоў, арнаментацыі, датаванні і шэрагу аналогій.

Абутак старажытнага Мінска (матэрыялы з раскопак 1945–1951, 1957–1961 гг.) упершыню даследаваўся К. П. Шутам [14]. У межах працы вызначаны асноўныя тыпы мінскага абутку, складзена яго храналогія, ахарактарызаваны асноўныя арнаментальныя матывы і канструкцыйныя элементы, зроблены першасныя вынікі аб месцы скураных рамёстваў (у прыватнасці, шавецкай справы) у гаспадарцы горада. Так, адзначаецца, што гараджане незалежна ад іх маёмаснага стану карысталіся скураным абуткам менавіта раменснай вытворчасці, хаця ў Мінску сустракаліся ў нязначнай колькасці ўзоры, якія з-за нізкай якасці і відавочнай непрафесійнасці пашыву могуць быць аднесены да хатніх вырабаў і належаць бядняцкай праслойцы горада. Адзначаецца арыентацыя рамяства на шырокі рынак, што праяўляецца ў стандартызацыі вырабаў і спрашчэнні тэхнічных прыёмаў [14, с. 75].

Агляд мінскага шавецкага рамяства і яго прадукцыі (абутак і галантарэя) здзейснены ў абагульняючай манаграфіі Э. М. Загарульскага па гісторыі і археалогіі Мінска [15, с. 266–274].

Артыкул па шавецкім рамястве Мінска XII–XVIII стст. выйшаў пад аўтарствам С. В. Тарасава і В. Е. Собаля. У ім разглядаюцца скураныя матэрыялы, здабытыя падчас археалагічнага даследавання Мінскага замчышча, на тэрыторыі былога Траецкага прадмесця, вуліцы Астроўскага і так званых Татарскіх агародаў, агульнай колькасцю каля тысячы адзінак [16]. У цэлым артыкул носіць азнаямляльны характар, пераважная ўвага надаецца познасярэднявечным узорам, узроўню развіцця і спецыялізацыі шэрагу скураных рамёстваў у познім Сярэднявеччы.

Арнаментацыя мінскіх чаравікаў, яе семантыка і месца ў беларускім мастацтве, паходжанне, шляхі пранікнення на тэрыторыю Беларусі таго ці іншага арнаментальнага матыву, а таксама яго сэнсавая эвалюцыя згодна з язычніцкім і хрысціянскім светаўспрыманнем асэнсоўваюцца ў асобным артыкуле С. В. Тарасава. Аўтар адзначае, што аздабленне мінскіх чаравікаў, нягледзячы на развіццё ў рэчышчы старажытнарускай традыцыі, мае шэраг асаблівасцей, якія збліжаюць іх з аналагічнымі вырабамі з Полацка і Гродна [17].

Аналіз інструментальнай базы сярэднявечных майстроў па скуры праз аб'яднальны агляд археалагічных матэрыялаў з двух ключавых гарадскіх цэнтраў паўночнай і цэнтральнай Беларусі правёў С. В. Тарасаў [18].

Значная колькасць матэрыялаў з арганікі (у тым ліку і «археалагічная скура») паходзіць з сярэднявечных гарадоў паўднёвай Беларусі з вільготным культурным слоем. Іх увядзенне ў навуковы зварот адбылося ў межах некалькіх манаграфій П. Ф. Лысенкі [19, с. 33–153; 20, с. 111–120, 190–191; 21, с. 77–78].

Найбольш адметнае месца займае праца, прысвечаная старажытнаму Бярэсцю [22, с. 287–303], дзе за гады раскопак было вынайдзена больш за 500 экз. скураных вырабаў добрай захаванасці. У тэматычным раздзеле манаграфіі падаюцца рэчазнаўчыя апісанні знаходак, вынікі статыстычных падлікаў. Колькасныя і якасныя характарыстыкі дадзенай катэгорыі рэчаў дазволілі аўтару дэталёва прааналізаваць, тыпалагізаваць і храналагізаваць многія аспекты шавецкай прадукцыі, у тым ліку арнаментыку скуранога абутку. П. Ф. Лысенка вылучыў шэсць тыпаў брэсцкага дэкору мяккіх туфель, кожны з якіх падзяляецца на пэўную колькасць варыянтаў. У аснове вылучэння першых чатырох тыпаў ляжаць колькасць папярэчных наколаў у адным шэрагу і наяўнасць дадатковых бакавых ліній наколаў. Пяты тып – зігзагападобны арнамент з дзвюма бакавымі лініямі, да шостага тыпу далучаны арнаменты, якія складаюцца з элементаў дуг і акружнасцей [22, с. 287–303].

Адзначанае дазваляе скласці ўяўленне аб маштабах адпаведнай крыніцавай базы на тэрыторыі Беларусі і ўзроўні яе апублікаванасці. Як вынікае, беларуская археалагічная медыявістыка, асвятляючы скураныя рамёствы, іх месца ў эканамічнай структуры гарадоў і ролю іх прадукцыі ў матэрыяльнай культуры сярэднявечнага насельніцтва, дзейнічала ў рамках класічных аналізатарскіх і апісальных схем. Аднак спецыяльных археалагічных работ у Беларусі, прысвечаных гарбарнаму і шавецкаму рамёствам старажытнарускага перыяду, адносна няшмат, яны пераважна артыкульнага характару і асвятляюць адпаведную рэчыўную калекцыю з таго ці іншага беларускага горада. Узровень распрацаванасці тэмы пакідае шырокае поле дзейнасці па максімальным зборы адпаведнага археалагічнага матэрыялу, увядзенні яго ў навуковы абарот, стварэнні агульнай карціны развіцця скураной вытворчасці на тэрыторыі Беларусі.

У рэчышчы разважанняў аб перспектывах вывучэння скураных рамёстваў варта адзначыць расійскіх даследчыкаў А. В. Курбатава (аўтар доктарскай дысертацыі па гарбарна-шавецкаму рамяству сярэднявечнай Расіі [23], некалькіх манаграфій і вялікай колькасці артыкулаў [24–26]); Д. А. Осіпава [27, 28] (вывучаў сярэднявечны скураны абутак XII–XVIII стст. з раскопак у Маскве і Падмаскоўі, марфалогію, тэхналогію абутковых калекцый [27, 28]). У сваіх працах навукоўцы дасягнулі новага (па пастаноўцы праблемы, колькасным і якасным адборы аб'ектаў даследавання, метадычным падыходзе) этапу.

Вызначаюцца наступныя тэматычныя кірункі даследчыцкай дзейнасці, якія могуць быць ужыты і да беларускіх матэрыялаў пры ўмове іх інфарматыўнасці: арганізацыя, узровень спецыялізацыі і дыферэнцыяцыі рамёстваў па скуры; інстытут вучнёўства; функцыянаванне дадзеных галін рамяства ў рамках агульнагарадской эканамічнай сістэмы (абкладанне падаткамі, характар збыту гатовай прадукцыі – на заказ і рынак, утылізацыя адыходаў); дзейнасць гарбарных майстэрань у межах гарадской прасторы, дакладней – іх месца ў структуры гарадской забудовы; карэкціроўка наяўнай класіфікацыі абутку з улікам яго функцыянальнай прыналежнасці і сацыяльнага становішча носьбіта; развіццё адпаведных рамёстваў у кантэксце агульных вытворчых рэвалюцый (тэхналагічных усплёскаў) эпохі.

Яшчэ адным актуальным кірункам даследчыцкай дзейнасці з'яўляецца ўвядзенне археалагічных матэрыялаў з тэрыторыі Беларусі ў агульнаеўрапейскі кантэкст шляхам праведзення тэхналагічных, канструкцыйных і культурна-гістарычных аналогій, высвятлення фактаў і шляхоў узаемапранікнення рамесных і мастацкіх ідэй. Карысны ў такім рэчышчы зварот не толькі да тэматычных прац расійскіх, але і польскіх [29–31], літоўскіх (В. В. Бебрэ, К. Навіцкас) даследчыкаў, а таксама да найбольш буйных спецыялізаваных заходнееўрапейскіх выданняў [32].

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. *Якунина Л. И.* Новгородская обувь XII–XVII вв. // Кр. сообщ. о докл. и пол. исслед. Ин-та истории и матер. культуры. 1947. Т. 17. С. 38–48.

2. *Изюмова С. А.* К истории кожевенного и сапожного ремесел Новгорода Великого // Тр. Новгород. археол. экспедиции. М., 1959. Т. 2, № 65. С. 192–222.

3. *Оятева Е. И.* Обувь и другие кожаные изделия древнего Пскова // Археол. сб. Государственного Эрмитажа. Л., 1962. Вып. 4. С. 77–94.

4. *Оятева Е. И.* Обувь и другие кожаные изделия Земляного городища Старая Ладога // Археол. сб. Государственного Эрмитажа. Л., 1965. Вып. 7. С. 42–59.

5. *Оятева Е. И.* К методике изучения древней кожаной обуви // Археол. сб. Государственного Эрмитажа. Л., 1973. Вып. 15. С. 105–111.

6. *Jodkowski J.* Grodno wczesnośredniowieczne w świetle prac wykopaliskowych dokonanych na Krylewskim zamku starym w Grodnie w latach 1932 i 1933. Warszawa, 1934.

7. *Durczewskij Z.* Stary zamek w Grodniew świetle wykopalisk dokonanych w latach 1937–1938. Grodno, 1939.

8. *Воронин Н. Н.* Древнее Гродно. М., 1954.

9. *Штыхаў Г. В.* Гарбарнае рамяство старажытнага Полацка // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1961. № 3. С. 63–73.

10. *Штыхаў Г. В.* Шавецкае рамяство старажытнага Полацка // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1962. № 3. С. 81–90.

11. *Штыхов Г. В.* Опыт исследования древнеполоцкой кожи // Сов. археология. 1963. № 4. С. 240–246.

12. *Бубенько Т. С.* Кожаная обувь средневекового Витебска XII–XVIII вв. (по материалам исследований Нижнего замка) // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Новыя матэрыялы і даследаванні. 1993. С. 127–137.

13. *Бубенько Т. С.* Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.). Витебск, 2004.

14. *Шут К. П.* Обувь древнего Минска // Вопр. истории : материалы IX конф. молодых ученых. Минск, 1965. С. 72–81.

15. *Загорульский Э. М.* Возникновение Минска. Минск, 1982.

16. *Собаль В. Е., Тарасаў С. В.* Абутак сярэдневяковага Мінска // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мінск, 1985. № 4. С. 34–36.

17. *Тарасаў С. В.* Арнаменты мінскіх чаравікаў // Мастацтва Беларусі. Мінск, 1985. № 12. С. 70–71.

18. *Тарасов С. В.* Технология и инструменты кожевенно-сапожного ремесла Полоцка и Минска (XI–XVIII вв.) // Памятники науки и техники 1987–1988 гг. Минск, 1989. С. 164–175.

19. *Лысенко П. Ф.* Города Туровской земли. Минск, 1974.

20. *Лысенко П. Ф.* Туровская земля IX–XIII вв. Минск, 1999.

21. *Лысенко П. Ф.* Древний Туров. Минск, 2004.

22. *Лысенко П. Ф.* Берестье. Минск, 1985.

23. *Курбатов А. В.* Кожевенное ремесло в средневековой России : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.06. СПб., 2012.

24. *Курбатов А. В.* Опыт исторической интерпретации изделий кожевенно-обувного производства // Древний Псков. Исследования средневекового города. СПб., 1994. С. 86–90.

25. *Курбатов А. В.* Уровень технологии кожевенного ремесла в древнерусский период // Ладога и Северная Европа. СПб., 1996. С. 81–83.

26. *Курбатов А. В.* Новгородская «революция XII века» и прогресс в кожевенном ремесле // У истоков русской государственности. СПб., 2007. С. 89–127.

27. *Осипов Д. О.* Кожаная обувь: информационные возможности археологических коллекций (по материалам раскопок в Москве) // Рос. археология. М., 2003. № 2. С. 17–30.

28. *Осипов Д. О.* Обувь Московской земли XII–XVIII вв. // Материалы охранных археологических исследований. М., 2006. Т. 7.

29. *Wiklak H.* Oduvie gdanskie z XIII–XIV wieku // Gdansk wczesnosredniowieczny. Gdansk, 1967. T. 6. S. 137–179.

30. *Wiklak H.* Polskie obuwie wczesnosredniowieczne z VIII–XIII w. na podstawie wykopalisk // Materialy Wczesnosredniowieczne. Wroclaw ; Warszawa ; Krakow, 1969. T. 6. S. 475–516.

31. *Wojtasik J.* Wczesnosredniowieczne wyroby ze skory znalezione na stanowisku 4 w Wolinie // Materialy Zachodnio-Pomorskie. Szczecin, 1960. T. 6. S. 159–208.

32. *Grew F., de Neergaard M.* Shoes and pattens // Medieval finds from excavations in London. London, 1988.

Паступіў у рэдакцыю 16.04.2015.

***Кацярына Андрэеўна Пярфільева*** – аспірантка кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, загадчык кафедры спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта А. А. Егарэйчанка.

*УДК 329.78(476)(091)«18/19»*

*В. А. ВЯРЫГА*

## ВУЧНЁЎСКАЯ МОЛАДЗЬ У ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Посвящена общественно-политическому движению учащейся молодежи на территории белорусских губерний в конце XIX – начале XX в. Показана роль учащейся молодежи в общественно-политической жизни на территории белорусских губерний в конце XIX – начале XX в. Отмечается, что на политическую активность ученической молодежи оказывали влияние социалистические политические партии, этническое, религиозное дифференцирование молодежи, развитие системы образования. Определены этапы в развитии молодежного движения с конца XIX в. до 1914 г. Отмечается, что в конце XIX в. – 1904 г. происходит процесс становления и развертывания ученического движения. Подчеркивается, что наибольшего подъема общественно-политическая деятельность учащейся молодежи достигла во время революции 1905–1907 гг., что в значительной степени было обусловлено влиянием социалистических партий. Анализируется деятельность учащихся с июня 1907 по август 1914 г. Делается вывод о том, что учащаяся молодежь принимала активное участие в политической жизни белорусских губерний, что заставляло власти пристально контролировать ее.

***Ключевые слова:*** молодежь; учащиеся; общественно-политическая жизнь; белорусские губернии.

The article is devoted to the social and political movement of student youth on the territory of Belarusian provinces in the late XIX – early XX centuries. The purpose of the arcticle describes the role of student youth in the political life of the territory of Belarusian provinces in late XIX – early XX centuries. This item shows that the political activity of student youth was under the influence of the socialist political parties, ethnic, religious differentiation of the younger generation and the development of the education system. Also, there is determination of the steps in the development of the youth movement in the late XIX century – 1914. It finds that at the end of the XIX century – 1904 was a process and development of student movement. This theme emphasizes that the socio-political activity of student youth has reached the greatest rise during the revolution of 1905–1907 due to the influence of the socialist parties. The activity of students from June 1907 to August was took an active part in the political life of the Belarusian provinces, that made authorities to control it too much.

***Key words:*** youth; pupils; social and political life; the Belarusian provinces.

Сярод усіх маладзёжных груп вучнёўская моладзь прымала самы актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX ст. Разам з тым пытанне, ці павінна навучэнская моладзь прымаць удзел у палітычным жыцці краіны, з’яўляецца важным і актуальным, прыцягваючым увагу многіх даследчыкаў у розныя часы.

Зразумела, што актыўны ўдзел моладзі ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў – гэта не выпадковасць. Вызначым шэраг фактараў, якія тым або іншым чынам уплывалі на палітычную актыўнасць беларускай моладзі.

П а - п е р ш а е, у другой палове XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі беларускіх губерняў актыўна развівалася сістэма народнай адукацыі, у асноўным у выглядзе пачатковых школ і сярэдніх навучальных устаноў.

Усяго ў беларускіх губернях налічвалася 76 934 чал., якія мелі адукацыю вышэй за пачатковую, што складала 4,1 % ад колькасці мясцовага пісьменнага насельніцтва. Перапісам 1897 г.